# Адлюстраванне барацьбы ідэалогій у культавай архітэктуры Беларусі (канец XVIII–пачатак XX ст.)

Багдановіч А. І. г. Мінск, БНТУ

Нават у таталітарных рэжымах, дзе пануе ідэакратыя, функцыяніруюць контрідэалогіі. Забароненыя і ганімыя, яны ўсё ж існуюць і кідаюць выклік існуючай афіцыйнай ідэалогіі [7, с. 8]. У разглядаемы перыяд на тэрыторыі Беларусі суіснавала шэраг ідэалагічных плыняў, што знаходзіліся ва ўзаемадзеянні, а часцей у барацьбе між сабой. Найбольш вострая барацьба адбывалася паміж пануючай ідэалогіяй расійскага ўрада, якая знайшла свае ўвасабленне ў трыадзінай формуле “самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць” і сарматызмам – ідэалогіяй шляхты былой Рэчы Паспалітай, значная частка якой у выніку трох падзелаў увайшла ў склад Расійскай імперыі. Гэтая барацьба спарадзіла цэлы шэраг літаратурных і мастацкіх помнікаў, спрыяла стварэнню шэрагу грамадска-палітычных аб’яднанняў і таварыстваў, прывяла да трох крывавых паўстанняў за аднаўленне Рэчы Паспалітай 1794 г., 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. Паражэнні ў якіх прывялі да масавых рэпрэсій: пакарання смерцю, турэмных зняволянняў і высылак у Сібір і іншыя рэгіены імперыі.

На наш погляд, барацьба паміж афіцыйнай ідэалогіей і ідэалогіей сарматызму стала адным з найбольш яскравых прыкмет грамадска-палітычнай барацьбы на тэрыторыі сучаснай Беларусі ў канцы XVIII–пачатку XX ст. Гэта супрацьстаянне знайшло свае адлюстраванне ў помніках архітэктуры Беларусі гэтага перыяду і ў першую чаргу ў культавым будаўніцтве. Помнікі культавага будаўніцтва – сімвалы веры. Яны заўседы нясуць адбітак ідэалогіі, што ляжыць ў аснове веравызнання.

Амерыканскі даследчык Рычард Вортман, які вывучаў гісторыю праўлення Мікалая I і Аляксандра III, пераканаўча паказаў, што менавіта гэтыя імператары ўключылі ў афіцыйную ідэалагічную дактрыну рускую нацыянальную ідэю, і сталі не на словах а на справе праводзіць яе ў жыццё. Менавіта Мікалай I дабіўся таго каб царкоўная архітэктура ў Расійскай імперыі стала “истинно русской” [3].

Заснавальнікам “сапраўды рускага” стылю, на нашу думку, стаў прыдворны архітэктар Канстанцін Тон, а ўзорам праваслаўнай рускай архітэктуры стаў пабудаваны па яго праекту і пад яго кіраўніцтвам Храм Хрыста Выратавальніка ў Маскве.

Дамікалаеўскі расійскі класіцызм, што праявіўся ў Беларусі ў дзейнасці архітэктараў Мікалая Аляксандравіча Львова і Джона Кларка, быў таксама следам ідэалогічнай барацьбы таму, што з 66 беларускіх праваслаўных храмаў, што былі пабудаваны або перабудаваны ў разглядаемы перыяд, 22 будаваліся ў стылі класіцызму (такая невялікая колькасць пабудаваных цэркваў і касцёлаў тлумачыцца тым, што мы разглядалі толькі тыя з іх, якія прызнаны помнікамі архітэктуры і горадабудаўніцтва) [10, с. 11].

Нават драўляныя храмы, якія звычайна будаваліся у стылі народных рамёстваў, адразу пасля трох падзелаў пачалі будавацца ў класічным стылі, як гэта было ў Шклове, Гомелі і Ельску. У гэтых гарадах драўляныя цэрквы сталі прамым падабенствам Гомельскага Петрапаўлаўскага сабора [10, с. 138]. Архітэктары каталіцкіх храмаў аддавалі перавагу стылям барока, псеўдаготыцы і псеўдараманскаму. Праваслаўныя ж барочныя цэрквы ў падаўляючай большасці сваёй былі або пабудаваныя задоўга да падзелаў Рэчы Паспалітай, або перабудаваныя ў праваслаўныя з каталіцкіх і ўніяцкіх храмаў. Толькі 2 з 16 пабудаваных ўжо пасля “інкарпарацыі” праваслаўных цэркваў адразу задумваліся як барочныя будынкі гэта драўляныя цэрквы ў Рубелі і Кажан-Гарадку, астатнія уяўляюць сабой перабудаваныя каталіцкія ці ўніяцкія храмы [10, с. 104–107].

Расійскія манархі ў XIX ст. захапляліся класіцызмам, асабліва гэта было характэрна для Аляксандра І. У гонар перамогі над Напалеонам ён задумаў стварыць у Маскве грандыезны храм Хрыста Выратавальніка не толькі як сімвал перамогі над Напалеонам, але і як сімвал адзінай Еўропы, якую ён марыў стварыць. Пабудову гэтага храма Аляксандр І меркаваў даверыць свайму прыдворнаму архітэктару, містыку і масону Аляксандру Лаўрэнцьевічу Вітбергу. Ён стварыў праект звычайнага для таго часу класічнага храма з калонамі. Праект спадабаўся Аляксандру І. Аднак Вітбергаўскаму праекту не суджана было ажыццявіцца не толькі таму, што праект адзінай Еўропы быў утапічны, але і ў значнай ступені з-за раптоўнай смерці імператара.

Пасля смерці Аляксандра I імператар Мікалай вырашыў выкарастаць ідэю будаўніцтва храма Хрыста Выратавальніка як сімвал свайго праўлення. Замест касмапалітычных ідэй, пакладзеным у аснову праекта свайго папярэдніка, ен вырашыў пакласці нацыянальныя рускія ідэалы. Свой новы храм Мікалай бачыў не як сімвал аб'яднанай Еўропы, а як сімвал супрацьстаяння Расіі Захаду. Для "рускага праекту" не падыходзілі класічныя формы, у якіх працавала большасць архітэктараў старой школы. Патрэбны быў новы чалавек, які быў здольны стварыць "рускі стыль". Такім чалавекам стаў, як заўжды, іншаземец, ці то нямецкага, ці то іспанскага паходжання.

Праект Канстанціна Андрэевіча Тона перамог на конкурсе святой Кацярыны ў Пецярбургу. Архітэктар меў рэдкі талент пасля нядоўгага акідвання вокам якога-небудзь будынку, схопліваць дух і літару пэўнага стылю. Так было і з Храмам Хрыста Выратавальніка архітэктар азнаеміўся з некалькімі старажытнарускімі цэрквамі і ўжо ведаў як адлюстраваць тагачасную рускую нацыянальную ідэю.

З 1831 г. К. Тон фактычна становіцца галоўным архітэктарам расійскай імперыі. Апублікаваны ім атлас узорных праектаў цэркваў быў аб'яўлены адзінай крыніцай пры пабудове цэркваў у Расіі. За ім паследаваў узорны атлас сялянскіх пабудоў. Калі перафразіраваць адно з выслоўяў цара, К. Тон стаў "кіраўніком штаба па архітэктурнай галіне пры бацьку камандзіры". У 1858 г. з яго шэдэўра храма Хрыста Выратавальніка знялі рыштаванні, пачалася доўгая работа па стварэнні інтэр'ера храма. Толькі ў 1881 г. сабор быў асвечаны і пачаў дзейнічаць. Гэты храм разам з Вялікім Крамлёўскім палацам сталі справай ўсяго жыцця Канстанціна Тона.

У Расійскай імперыі, бадай што ні было ніводнага помніка рускай архітэктуры, які б ганьбілі больш, чым храм Хрыста Выратавальніка. Мастак Аляксандр Іваноў назваў яго "каласальнай шафай", Аляксандр Герцэн "пяцігаловай бутэлькай з цыбулінамі замест коркаў на індавізантыйскі манер", рэлігійны філосаф Яўгеній Трубяцкі "вялізарным самаварам, вакол якога благадушна сабралася патрыярхальная Масква". Аднак у адрозненні ад тагачаснай эліты у народзе Храм Хрыста Выратавальніка карыстаўся любоўю. Задоўга да асвячэння яшчэ пры Мікалаі I

ён стаў маскоўскай выбітнасцю. Любы селянін з далёкай правінцыі, калі трапляў ў Маскву, лічыў сваім абавязкам прыйсці на месца будоўлі. Паштоўкі з выявай храма вялізарнымі тыражамі распаўсюджваліся па краіне. Часта яны памяшчаліся разам з іконамі ў чырвоных кутках сялянскіх хат. Пакаеўкі і майсцеравыя прыклейвалі іх побач з выявамі членаў царскай фаміліі на крышках куфраў са сваім скарбам.

Храм Хрыста Выратавальніка і Вялікі Крамлёўскі палац, ствараліся як адзіны ідэйна-архітэктурны ансамбль у рамках мікалаеўскай рэканструкцыі Масквы. Дзякуючы Тону і Мікалаю I быў завершаны грандыёзны трыптых, у цэнтр якога ўвайшоў Крэмль, які Маркіз дэ Кюсцін (французскі арыстакрат і манархіст, пісьменнік, вандроўца, што набыў сусветную вядомасць выданнем сваіх запісак пра Расію) назваў "калыскай сучаснай Расійскай імперыі" і "цытадэллю, пабудаванай на мяжы Еўропы і Азіі". На усход ад гэтай цытадэлі помнік перамогі рускіх над Усходам, Храм Васіля Блажэннага, а на захад – Храм Хрыста Выратавальніка, як сімвал перамогі над Захадам. Менавіта гэты трыпціх і лёг у аснову ўжо ўзгаданага Атласу ўзорных праектаў цэркваў Расійскай імперыі, які стаў шаблонам для пабудовы праваслаўных храмаў на ўсёй тэрыторыі краіны [5].

У Беларусі згодна гэтаму атласу пабудаваны мноства цэркваў якія прызнаны помнікамі архітэктуры і горадабудаўніцтва. Бясспрэчна, яны не былі копіямі храма Хрыста Выратавальніка або сабора Васіля Блажэннага, аднак у той ці іншай меры ў іх можна пазнаць і вышэй узгаданыя шэдэўры маскоўскага культавага дойлідства і крамлёўскі палац і самі крамлёўскія вежы. У нашай краіне такія храмы назвалі коратка і ясна – мураўёўкамі (па празвішчу сумнавядомага віленскага генерал-губернатара). Праектавалі іх у Беларусі архітэктары Пётр Пятровіч Мяркулаў, Мікалай Іванавіч Чэрвінскі, Віктар Іванавіч Струеў і інш [11, с. 143].

З пункту гледжання ідэалагічнай барацьбы царква ў псеўдарускім архітэктурным стылі – гэта сцяг перамогі аднаго з трох прынцыпаў афіцыйнай ідэалогіі (праваслаўя) над іншадумствам. Іншая справа, што перамога гэта дасягалася не шляхам пераканання іншадумцаў у перавагах праваслаўя над іншым светапоглядам, а адміністрацыйным гвалтам. Гвалт гэты

заключаўся ў адабранні храмаў у іншых канфесій і перадачы іх праваслаўнай царкве, перабудове каталіцкіх храмаў у стылі барока ў праваслаўны неарускі стыль і ў пабудове правслаўных цэркваў у гарадах, дзе падаўляючая большасць насельніцтва складалі каталікі. У Беларусі надзвычай многа прыкладаў такога адміністрацыйнага гвалта і самым яскравым, у гэтым сэнсе, я лічу лёс Пінскага касцёла Міхаіла Архангела.

16 студзеня 1705 г. Вялікі гетман літоўскі князь Міхаіл Вішнявецкі і яго жонка Кацярына заснавалі каталіцкі манастыр бернардзінцаў. У 1717 г. драўляны комплекс манастыра быў пабудаваны. У манастырскі комплекс уваходзілі: будынак самаго манастыра, драўляны касцёл Міхаіла Архангела, гаспадарчыя пабудовы, агароды і фруктовы сад. Ішлі гады, вернікі ахвяравалі манастыру грошы, завяшчалі маёмасць. Да 1770 г. у манастыры сабраліся сродкі, каб закласці каменны касцёл. Нажаль, імя яго архітэктара да нас не дайшло. 13 студеня 1787 г. касцел быў асвечаны. Пасля паўстання 1830–1831 гг., па загаду расійскага ўрада будынак адыйшоў да праваслаўнага прыходу. Новыя гаспадары перабудавалі храм па свайму густу. У выніку атрымалася барока з праваслаўнай цыбулінай над алтарнай часткай храма, што выглядае зусім недарэчна [9, с. 501].

Мікалаеўская царква ў Навагрудку з'яўляецца больш удалай спробай спалучыць "абавязковыя" праваслаўныя элементы і каталіцкае барока. Гэта таксама былы каталіцкі касцёл, пабудаваны ў 1780 г. У 1846 г. ен быў перададзены праваслаўнай царкве. Як і касцёл Міхаіла Архангела ў Пінску, ён быў перабудаваны ў адпаведнасці з патрабаваннямі афіцыйнага архітэктурнага стылю, аднак, у адрозненні ад пінскага храма, гэтаму пашанцавала з архітэктарам больш. Храм і ў новым абліччы выглядае арганічна. Імя архітэктара да нашага часу не дайшло, але бясспрэчна гэта быў майстр сваёй справы, які змог спалучыць, на першы погляд, неспалучальныя архітэктурныя элементы.

Неабходна адзначыць, што падобны лёс маюць многія архітэктурныя помнікі Беларусі: гэта і Мікалаеўская царква ў Міры, і царква Благавешчання ў Друі, і Кармеліцкі храм Успення Багародзіцы з манастыром у Глыбокім, і царква ў Паставах і інш. Усе яны былі каталіцкімі храмамі, якія перадаваліся праваслаўнай

царкве і перабудоўваліся ў адпаведнасці з праваслаўнымі густамі [11, с. 165–208].

Вялікі інтарэс для разглядаемай праблемы ўяўляе Успенскі сабор Жыровіцкага манастыра, які быў пабудаваны ў 1650 г. Для ўніятаў манастыр у Жыровічах быў святыняй такога ж маштаба, як для польскіх каталікаў манастыр у Чэнстахове. Першапачаткова Успенскі сабор разам з манастырскім комплексам прадстаўляў сабой барочную пабудову. Дакладна не вядома, калі быў парабудаваны гэты сабор у класічны стыль. Ва ўсіх магчымых крыніцах указваецца вельмі прыблізная дата – першая палова XIX ст. Асабіста я перакананы, што перабудова храма адбылася адразу пасля таго, як у 1839 г. у Беларусі была ліквідавана ўніяцкая царква. Манастыр, як і храм стаў праваслаўным, у гэты час ён і быў перабудаваны ў стылі ўсё яшчэ папулярнага ў сярэдзіне XIX ст. класіцызму. Перабудова Успенскага сабора ў Жыровічах у стылі класіцызма сведчыць аб тым, што тонаўскі дыктат у адносінах да праваслаўных цэркваў быў не такі ўжо і жорсткі. А магчыма класічны стыль для перабудовы сабора быў абраны для таго, каб не абвастраць і так няпростую сітуацыю звязаную з пераводам уніятаў у праваслаўе [11, с. 147–148].

Неабходна адзначаць, што пры Аляксандры II Свяцейшы Сінод пачаў часткова адраджаць класіцызм, таму ў 60-х гг. XIX ст. у многіх правінцыяльных гарадах Расійскай імперыі пачалі будавацца класічныя храмы. Да такіх храмаў адносіцца Сабор Аляксандра Неўскага ў Пружанах, які быў пабудаваны і асвячаны ў 1866 г. [4]. Нягледзячы на гэта, класіцызм не мог супрацьстаяць тонаўскім прынцыпам у архітэктуры.

Прыкладам барацьбы праваслаўя і каталіцтва можа стаць і Свята-Пакроўскі кафедральны сабор у Гродне, які пачаў дзейнічаць у 1905 г. Будаваць праваслаўны сабор у каталіцкім горадзе – гэта, бясспрэчна, ідэалагічны крок. Нават і ў наш час, калі колькасць праваслаўнага насельніцтва ў Гродне з’яўляецца значнай, сабор амаль ніколі не запаўняецца вернікамі, то ў дарэвалюцыйны час ён фактычна выконваў функцыю гарнізоннай царквы [1, с. 455–456].

Гарадзеншчына здаўна была Чорнай Руссю і будаваць праваслаўныя цэрквы тут пачалі яшчэ ў XII ст., таму пабудова Мураўёўкі ў Гародні была ў пэўнай ступені гістарычна апраўдана.

А вось пабудова каласальнага праваслаўнага сабора ў Варшаве ў 1894–1912 гг. было ні чым іншым як ідэалагічнай дыверсіяй царызма супраць нацыянальнай самасвядомасці палякаў. Каб уявіць маштабы абразы, якую нанёс царскі ўрад непакорнаму народу, прапаную ўявіць барочны каталіцкі касцёл дзе-небудзь на тэрыторыі Крамля ці на Чырвонай плошчы ў Маскве.

Аляксандра-Неўскі сабор ў Варшаве стаў самым высокім будынкам ў горадзе. Яго званіца ўзвышалася на 70 м. Сам ён быў пабудаваны ў стылі тонаўскай архітэктуры. На думку генерала-губернатара прывіслінскага краю І.В. Рамейкі-Гурко, які быў ініцыятарам пабудовы храма і старшынёй будаўнічага камітэта, сабор гэты прысвячаўся “памяці рускіх людзей, крывёй якіх паліта Варшава, дзякуючы палітычнай і рэлігійнай нянавісці да Расіі” [2, с. 124]. Таму не дзіўна, што пасля набыцця Польшай незалежнасці храм быў узарваны, пры чым зроблена гэта было ўсенародна. Варшаўскі магістрат выпусціў спецыяльныя боны, што забяспечваліся коштам матэрыяла, атрыманага ў выніку зноса сабора, для таго каб кожны паляк меў магчымасць атрымаць дачыненне да зносу праваслаўнага сабора (боны былі таннымі) [6, с. 25].

Бясспрэчна, стваральнікі варшаўскага Аляксандра-Неўскага сабора ў канцы XIX ст. не выключалі магчымасці разбурэння гэтага храма, таму яны зрабілі ўсё, каб патэнцыяльныя будучыя разбуральнікі спаўна атрымалі славу Герастрата. У пабудову Аляксандра-Неўскага сабора было ўкладзена 3 087 027 руб. На той час гэта была велізарная сума. Храм будавалі і ўпрыгожвалі лепшыя рускія архітэктары і мастакі. Дастаткова сказаць, што яго афармленнем займаліся В.М. Васняцоў, Н.Н. Харламоў, В.В. Бяляеў, Н.А. Кошалеў, А.П. Рабушкін і інш [2, с. 126]. У Маскве для сабора было адліта 14 званоў, самы вялікі з якіх быў 5-ым па велічыні ў Расійскай Імперыі. Для ўпрыгожання храма і багаслужэння ў Аляксандра-Неўскім саборы было каля 10 000 прадметаў, якія мелі мастацкую каштоўнасць сусветнага узроўню. Асоба каштоўным упрыгожваннем храма сталі вялізарныя мазаічныя пано, якія і да нашага часу лічацца найлепшымі ў сваім родзе [6, с. 26]. Сем з гэтых пано былі ў 30-я гг. уратаваныя і размешчаныя ў спецыяльна пабудаваным Пакроўскім саборы ў Баранавічах [11, с. 40].

Помнікам адміністрацыйнага гвалту з’яўляецца і лёс гістарычнага цэнтра Мінска. У 1499 г. Мінск атрымаў магдэбургскае права, архітэктурным сведчаннем гэтага стала мінская ратуша якая была пабудавана ў стыле паўночна-еўрапейскага рэнесанса, але ў выніку шматлікіх войнаў і пажараў яна шмат разоў перабудоўвалася і ў сярэдзіне XVIII ст. была перабудавана ў стылі барока. Наступная перабудова ў стылі класіцызму адбылася ў канцы XVIII ст. па праекту архітэктара Крамера. У часы Расійскай імперыі Ратушу прыстасавалі пад тэатр, а ў 1851 г. ратуша была знесена, відаць таму, што нагадвала мінчанам часы, калі горад меў магдэбургскае права. Неабходна адзначыць, што Мікалай I асабіста аддаў загад аб яе зносе. Але будынку пашанцавала, бо захаваліся падрабязныя чарцяжы, па якіх у пачатку XXI ст. мінская ратуша была адноўлена.

Яшчэ адзін след ідэалагічнай барацьбы – гэта Святадухаўскі сабор, заснаваны ў 1616 г. Гэты архітэктурны помнік быў пабудаваны ў рэнесансавым стылі. Яго фасад быў распісаны фрэскамі, якія ўтваралі падабенства іканастаса. Гэта асаблівасць была характэрна для беларускіх уніятскіх і праваслаўных храмаў XVII ст. У сярэдзіне XIX ст. яго перабудавалі ў мураўёўку.

У 1936 г. барацьбіты з рэлігійным дурманам знеслі яго, а пляцоўка храма так і засталася не забудаванай. Побач размяшчаліся жаночы і мужчынскі манастыры бернардзінцаў з храмамі, што былі пабудаваны ў XVII ст. у стылі барока. Касцёл манастыра бернардзінак на сённяшні дзень з’яўляецца праваслаўным кафедральным саборам Святога духа. Касцёл манастыра бернардзінцаў у наш час выкарыстовываецца як архіў.

Яшчэ адзін храм, што падвергся перабудове на праваслаўны манер – мінскі касцёл дамініканцаў: ён таксама быў пабудаваны ў XVII ст. у рэнесансавым стылі. У XIX ст. яго забралі ў каталікаў і перабудавалі ў мураўёўку. Пад час другой Сусветнай вайны ён атрымаў значныя пашкоджанні і канчаткова быў знесены ў канцы 40 гг. XX ст.

На вуліцы Няміга размяшчаецца самы стары будынак Мінска – Петрапаўлаўская царква. Пасля заключэння берасцейскай уніі ў 1596 г., усе праваслаўныя храмы горада былі перададзены ўніятам. Пры гэтым засталася значная колькасць тых, хто захацеў застацца ў праваслаўі, і, ў рэшце рэшт, ім ўдалася дабіцца права на

будаўніцтва новай каменнай царквы. Царкву пачалі будаваць ў 1612 г. і закончылі у 1620 г. З цягам часу колькасць праваслаўных у Беларусі ў цэлым і ў Мінску ў прыватнасці паменшылася амаль да поўнага знікнення. У выніку ў канцы XVIII ст. храм прыйшоў у заняпад. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ен быў адрамантаваны адным з фаварытаў Кацярыны II і пераіменаваны ў Кацярыненскую царкву. Некаторы час ён быў кафедральным саборам, але пасля гэтыя функцыі перайшлі да Святадухаўскага сабора на саборнай плошчы. Як мы памятаем назву Святадухаўскага сабора атрымаў былы касцёл бернардзінак.

Трэба адзначыць, што “выпраўленне” беларускіх храмаў не абыйшло і Петрапаўлаўскі сабор (Кацярыненскую царкву). Але напачатку XX ст. храму вярнулі першапачатковы выгляд.

За езуіцкім касцёлам на месцы кінатэатра “Перамога” і будынка пракуратуры знаходзіўся манастыр бенядзікцінак, які быў пабудаваны ў другой палове XVII ст. Як і многія іншыя каталіцкія храмы Беларусі ў XIX ст. ён быў перададзены праваслаўным, і ў 1872 г. перабудаваны ў псеўдарускім стылі. Пасля вайны храм нядрэнна захаваўся, але быў разбураны разам з манастыром ў 60-я гады XX ст. [8].

Такім чынам, праваслаўная цыбуліна з крыжом за перыяд з 1772 г. па 1917 г. узнялася над шматлікімі барочнымі храмамі Беларусі. У многіх выпадках яна была сведчаннем адсутнасці ўсялякага мастацкага густу ў людзей, ад якіх залежыла яе ўзвядзенне, і вельмі рэдка расійскаму самадзяржаўю ўдавалася знайсці архітэктараў, што маглі арганічна спалучаць барочную архітэктуру з праваслаўнымі патрабаваннямі. Многія архітэктары ўвогуле не браліся за гэтую амаль безнадзейную справу і перабудоўвалі неправаслаўныя барочныя храмы ў класічныя.

**Выкарыстаная літаратура**

1. Андриевская, З.Я. [и др.] Свята-Пакроўскі кафедралны сабора ў Гродне // Туристская энциклопедия Беларуси / Под ред. И.И. Пирожника. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2007. – 647 с.

2. Берташ, А.В. Православная Варшава в 1920–1930-е гг. / А.В. Берташ // Зарубежная Россия 1917–1939; под ред. В.Ю. Черняев, А.Л. Дмитриев, Л.А. Ивонинская [и др.] – СПб.: Лики России, 2003. – С. 122–132.

3. Вортман, Р. «Официальная народность» и национальный миф российской монархии XIX века / Р. Вортман // Культурные практики в идеологической перспективе: Россия XVIII–начало XX в. / Под ред. Н. Охотина. М.: ОГИ, 1999 – вып. 3 – С. 233–244.

4. Гурин, А.В поисках утраченного / А. Гурин // СБ Беларусь сегодня – 2006. – 14 янв. – С. 27.

5. Козлов, Г. Архитектор Константин Тон / Г. Козлов // Немецкая волна [Электронный ресурс] – 2003. Режим доступа: http://dw-club.org/dw/article/0,2144,831153,00.html – Дата доступа 16.07.2016.

6. Лабынцев, Ю., Щавинская, Л. Александро – Невский собор в Варшаве. / Ю. Лабынцев, Л. Щавинская Л. Александро // Православное обозрение "Радонеж" – 1999 – 30 апр. – № 9–10 – С. 23–27.

7. Решетников, С.В., Старовойтова, Л.В. Предыстория возникновения термина «идеология» / С.В. Решетников, Л.В. Старовойтова // Основы идеологии белорусского государства: Учебное пособие для вузов / Под общ. ред. С.Н. Князева, С.В. Решетникова. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2004. – Гл. 1. – С. 3–14.

8. Смалюк, А. Исторический центр Минска. / А. Смалюк // Livejournal [Электронный ресурс] – 2006. Режим доступа: http://antonsm.livejournal.com/2101.html – Дата доступа 16.07.2016.

9. Ярашэвіч, А. Пінскі кляштар бернардзінцаў / А. Ярашэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш – Мінск.: БелЭн, 1999. – Т. 5. М – Пуд. – С. 501–592.

10. Чантурыя, В.А. История архитектуры Белоруссии / В.А. Чантурыя – Минск: Вышэйшая школа, 1977. – 324 с.

11. Чантурыя В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В.А. Чантурыя – Минск: Полымя, 1986. – 236 с.

## Кальвінізм у гісторыі і культуры Беларусі

Багдановіч А. Г. г. Мінск, БНТУ

У сярэдзіне XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім пачалося імклівае распаўсюджванне ідэй заходнееўрапейскага пратэстантызму. Рэфармацыя на Беларусі не была простым